Гэты студэнцкі вопыт давялося потым улічваць у педагагічнай працы, калі надарылася наведаць больш за палову раёнаў Віцебшчыны, і, прызнаюся, добрыя, цёплыя ўспаміны засталіся не толькі ад сустрэч з таленавітымі, часам унікальнымі інфармантамі, але і проста сардэчнымі, гасціннымі людзьмі.

Як вядома, з-за адсутнасці фінансавання экспедыцыйны выезд студэнцкіх груп у апошнія дзесяцігоддзі не практыкуецца, але палявое абследаванне рэгіёнаў Беларусі не перапыняецца. Сведчанне таму, у прыватнасці, рэгіянальныя, жанравыя, аўдыё- і відэаархівы Вучэбна-навуковай лабараторыі (ВНЛ) беларускага фальклору БДУ, у якіх належнае месца займаюць і матэрыялы Паазер'я. Прывяду прыклад з рэестра толькі аднаго – Полацкага – раёна (фонд 2, вопіс 14), у якім за апошнія дзесяць гадоў занатавана адпаведна 73 тапанімічных і 1837 фальклорных адзінак (толькі ў рэгіянальным архіве), сярод якіх прадстаўлены самыя розныя паэтычныя, празаічныя жанры, а таксама апісанні і фіксацыі абрадаў.

Зварот да канкрэтных прыкладаў дазваляе выявіць некаторыя дамінантныя і маргінальныя, другасныя характарыстыкі вуснай народнай творчасці Падзвіння і асаблівасці яе бытавання ў канкрэтных мікрарэгіёнах. Пры гэтым вызначаюцца і агульныя, уласцівыя ўсяму сучаснаму фальклору рысы: амбівалентнасць, полісемантычнасць вобразаў, жанравая і моўная інтэрферэнцыя, дыфузія пры захаванні пэўных генералізуючых пачаткаў. Так, пад кіраўніцтвам Л.К. Тарасюк у 1985 годзе ў в. Каханавічы быў зафіксаваны шэраг цікавых узораў народнай лірыкі, сярод якіх вылучаюцца вясельныя сіроцкія песні. Аднак прывядзём іншыя: купальскую і радзінную (абедзве з жартоўнай канатацыяй):

Іван, Іван ды Мар'я, / На гарэ ды купалле / А пад гарой карыта / Поўна вады наліта / Там дзевачкі ножкі мылі, / А мальчыкі ваду пілі / Іван, Іван ды Мар'я, / На гарэ купалле / А пад гарой карыта, / Поўна мёду наліта / Там пчолкі ножкі мылі, / А дзевачкі пілі (ад М.І. Глінскай, 1907 г. нар.) [1].

Песня, відаць, не з'яўляецца цалкам арыгінальнай, яе варыянты выяўлены і ў іншых мясцінах, аднак твор вабіць арганічнай паяднанасцю дзвюх стыхій: высокай язычніцкай, святочнай і бытавой, гумарыстычнай, што зусім не зніжае агульную танальнасць.

У сваю чаргу ўзор радзіннай паэзіі дазваляе даследчыку ўбачыць не толькі той самы жанравы дуалізм, але і зафіксаваны студэнткай характэрны характэрны для паўночна-усходняга дыялекту казус фанетычнай дысіміляцыі (падкрэсленыя гукі-літары, відаць, вымаўляюцца як Ъ): Кацярынушка гарох сеяла, / А пасеяўшы, у грабы пайшла. / З грабоў прыйшоўшы да забалела. / – Мамачка, мая галоўка баліць. / Дачушка мая, завяжы платок. / Мамачка мая, платок караток. / Дачушка мая, узлезь на печку. / Мамачка мая, там дзіця мала. / Дачушка мая, да дзе ж ты брала? / Мамачка мая, у грабах найшла. / Дачушка мая, нашто ж ты брала? / Мамачка мая, а мне жаль стала (ад Е.І. Мацкевіч, 1899 г. н.) [1].

Натуральна, пазначаная праблема вымагае не эскізна-пункцірнай, а больш грунтоўнай гаворкі з выяўленнем магчлівых тыпалагічных паралеляў і парадыгм. Важна толькі, каб феномен палявых фальклорных росшукаў не стаўся ўсяго толькі фактам далёкай гісторыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Архіў ВНЛ беларускага фальклору Беларус. дзярж. ун-та. – Фонд 2. – Воп. 4. – Спр. 9.

## АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКАЙ ПАЛІТЫКІ ГЕНАЦЫДУ ЯЎРЭЙСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
### (НА ПРЫКЛАДЗЕ Г. ПОЛАЦКА)

*канд. гіст. навук А.І. КОРСАК*
*(Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*Нягледзячы на наяўнасць значнай колькасці прац, у якіх закранаецца праблема Халакоста, застаецца шмат звязаных з ёю маладаследаваных і недаследаваных праблем, таму ў дадзеным артыкуле аб'ектам даследавання з'яўляецца правядзенне нацысцкай Германіяй палітыкі ізаляцыі яўрэйскага насельніцтва і знішчэнне гета на тэрыторыі Полацка ў 1941 годзе. У працы вырашаюцца наступныя задачы: па-першае, адлюстраваны меры, якія прадпрымаліся нямецка-фашысцкімі акупантамі дзеля пазбаўлення асоб яўрэйскай нацыянальнасці палітычных і эканамічных праў; па-другое, разглядаецца працэс паступовага ізалявання ад іншага насельніцтва і стварэння гета – канцэнтрацыйнага лагера для размяшчэння яўрэйскага насельніцтва на прыкладзе г. Полацка; па-трэцяе, паказаны метады карнай палітыкі нямецка-фашысцкіх захопнікаў у дачыненні да яўрэяў г. Полацка.*

Другая сусветная вайна з'явілася адной з самых трагічных старонак у гісторыі XX стагоддзя. Яна ўцягнула ў сваю арбіту больш за тры чвэрці насельніцтва зямнога шара і была самай кровапралітнай і разбуральнай. Здзейсненыя нацыстамі ў перыяд іх дванаццацігадовага панавання ў Германіі і асабліва ў часы другой сусветнай вайны злачынствы не маюць аналагаў у гісторыі чалавечай цывілізацыі.

Нямецка-фашысцкія акупанты і іх пасобнікі знішчалі многія народы, аднак поўнасцю знішчаны былі толькі цыгане, а страты сярод яўрэйскага насельніцтва складаюць прыкладна 6 мільёнаў, трэць нацыі. Гэта было не проста забойства велізарнай колькасці людзей, а спроба знішчыць яўрэйства як этнас.

Генацыд яўрэяў Еўропы звычайна называюць словам «халакост». Пад дадзеным паняццем разумеецца знішчэнне нацыстамі і іх пасобнікамі яўрэйскага насельніцтва ў Германіі і на акупіраваных ёй тэрыторыях у 1939 – 1945 гадах. Яго этымалагічная крыніца – грэчаскае слова «holocaustos»: holos – «цэлы, цалкам, поўнасцю», kaustos – «спаленне». У яўрэйскага насельніцтва яшчэ ў біблейскай гісторыі існавала некалькі відаў ахвяр: ахвяра спалення, ахвяра граху, ахвяра віны, ахвяра ачышчэння. Грэчаскі назоўнік «holocaustos» выкарыстоўваўся ў Бібліі для абазначэння яўрэйскай ахвяры [1, с. 36]. У навуковае абарачэнне дадзены тэрмін быў уведзены ў пачатку 60-х гадоў ХХ стагоддзя лаўрэатам Нобелеўскай прэміі пісьменнікам Элі Візэлем для абазначэння генацыду цэлага народа ў крэматорыях нацысцкіх лагераў смерці: «Не ўсе ахвяры нацызму былі яўрэямі, але ўсе яўрэі былі ахвярамі нацызму» [2, с. 1]. У гэтым і складаецца асаблівасць лёсу яўрэйства ў перыяд панавання гітлераўцаў у параўнанні з іншымі народамі акупіраваных тэрыторый.

У 1943 годзе Р. Лемкін увёў тэрмін «генацыд», маючы на ўвазе палітыку нацыстаў у дачыненні да яўрэяў у гады другой сусветнай вайны. Але дадзены тэрмін шырэйшы, чым Халакост, так як уключае ў сабе не толькі масавае знішчэнне цэлага народа, але і меры па абмежаванні правоў у палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнай сферах жыццядзейнасці [3, с. 15].

У ізраільскай гістарыяграфіі для абазначэння трагедыі яўрэйскага народа прымяняюцца тэрміны «Катастрофа», «Шоа». Гэта было злачынства супраць чалавецтва, прыняўшае гістарычныя маштабы, злачынства, якое, па меркаванні большасці людзей, неабходна зразумець і вывучыць. Катастрофа адрозніваецца ад іншых масавых забойстваў людзей, вядомых у гісторыі чалавецтва, і па колькасці забітых, і па намерах знішчыць усіх яўрэяў, па планаванню і дасканаласці правядзення гэтых акцый.

Нацысты выкарыстоўвалі ў сваёй тэрміналогіі ўмоўнае паняцце «канчатковае вырашэнне яўрэйскага пытання», пад якім разумелася пагалоўнае знішчэнне асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Злачынствы нацызму адлюстроўвалі яго ідэалагічную канцэпцыю, галоўнымі элементамі яе былі расавая тэорыя і антысемітызм, на падставе якіх ажыццяўляўся генацыд яўрэйскага насельніцтва.

Пасля заканчэння другой сусветнай вайны тэма знішчэння яўрэйскага насельніцтва некалькі дзесяцігоддзяў была ў забыцці. Яна з'ўлялася закрытай у першую чаргу для афіцыйнай акадэмічнай гістарыяграфіі. Але трэба адзначыць тое, што фармальнай цэнзурнай забароны – не ўзгадваць ахвяры Халакосту – не было. Розныя аспекты генацыду яўрэйскага насельніцтва даследаваліся ў рамках вывучэння нацысцкай Германіі, другой сусветнай (Вялікай Айчыннай) вайны, у кантэксце знішчэння «мірных жыхароў», але комплекснага даследавання не праводзілася. Толькі з распадам савецкай дзяржавы становішча ў вывучэнні пытанняў Халакосту змянілася: сталі даступнымі для навукоўцаў архіўныя дакументы і матэрыялы, пачалі публікавацца ўспаміны відавочцаў тых падзей і г.д.

Тэарэтычнай базай для акупацыйнага рэжыму была расавая тэорыя аб нераўназначнасці народаў і аб выключнай ролі германскага народа, якая павінна была служыць абгрунтаваннем права А. Гітлера і нацысцкай Германіі панаваць над іншымі дзяржавамі. Як выказаўся Г. Гімлер: «Германія – сэрца і мозг Еўропы, цэнтр ствараючай арыйскай расы» [4, с. 290]. Таму галоўнай мэтай унутранай і знешняй палітыкі нацыянал-сацыялістычнай дзяржавы абвяшчалася дасягненне сусветнага панавання і атрыманне «жыццёвай прасторы» на Усходзе – у Польшчы і СССР для выбранага германскага народа. А. Гітлер пісаў у кнізе «Мая барацьба»: «Наша дзяржава будзе перш за ўсё імкнуцца ўсталяваць здаровую, натуральную жыццёвую прапорцыю паміж колькасцю нашага насельніцтва і тэмпам яго росту, з аднаго боку, і колькасцю і якасцю нашых тэрыторый – з другога. Толькі так нашая знешняя палітыка можа забяспечыць лёс нашай расы, аб'яднанай у нашай дзяржаве» [5, с. 255].

«Канчатковае вырашэнне яўрэйскага пытання» на тэрыторыі Беларусі пачалося адразу пасля яе акупацыі ў 1941 годзе. Паводле адміністрацыйнага распараджэння № 1 камандуючага тылам групы армій «Цэнтр» генерала пяхоты М. фон Шэнкендорфа ад 7 ліпеня 1941 года ўводзіліся адметныя знакі для яўрэйскага насельніцтва: «Усе яўрэі і яўрэйкі, якія знаходзяцца на занятай рускай тэрыторыі і дасягнуўшыя 10-гадовага ўзросту, неадкладна абавязаны насіць на правым рукаве верхняга адзення і сукенкі белую паласу шырынёй да 10 см з намаляванай на ёй сіяніцкай зоркай або жоўтую павязку шырынёй да 10 см. Такімі павязкамі забяспечваюць сябе самі яўрэі і яўрэйкі. Яўрэям катэгарычна забараняецца вітацца з іншымі людзьмі» [6].

Акрамя ўжо існуючых правіл паводзін паводле дырэктывы Г. Лозэ ад 13 жніўня 1941 года яўрэям таксама забаранялася: выязджаць з мясцовасці або мяняць месца жыхарства без належнага дазволу гебітс-камісара ці штабс-камісара; карыстацца тратуарамі, грамадскім транспартам, месцамі і ўстановамі адпачынку, наведваць тэатры, кінатэатры, бібліятэкі, музеі, школы, лякарні; валодаць аўтамашынамі і радыёпрыёмнікамі і г.д. [7, с. 54]. У адпаведнасці з загадам Дзяржаўнага камісара Остланда Г. Лозэ ад 6 верасня 1941 года «для яўрэяў мясцовыя акружныя камісары, у залежнасці ад неабходнасці, устанаўліваюць асобую каменданцкую гадзіну» [8, с. 154]. Урачам з ліку асоб яўрэйскай нацыянальнасці дазва-

лялася лячыць ці кансультаваць толькі яўрэйскіх пацыентаў. У створаныя гета яны накіроўваліся для лячэння яўрэяў. У выпадку невыканання ўсіх загадаў і распараджэнняў яўрэйскае насельніцтва каралася смерцю.

Не выключэннем у правядзенні нацысцкай палітыкі «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання» з`яўляецца тэрыторыя г. Полацка, якая была занята нямецка-фашысцкімі акупантамі праз тыдзень пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Часу для эвакуацыі насельніцтва дадзенай тэрыторыі не было, таму амаль усё мясцовае жыхарства засталося на сваіх месцах, не выключэннем у дадзеным выпадку было і яўрэйскае насельніцтва.

Паводле «Інструкцыі аб асобных абласцях да дырэктывы № 21 (план «Барбароса»)» на акупіраванай тэрыторыі, якая знаходзілася за раёнам баявых дзеянняў, арганізоўвалася ўласнае палітычнае ўпраўленне. Згодна з гэтым тэрыторыя з улікам нацыянальнасці насельніцтва і ў прыблізным суаднясенні з межамі дзеянняў груп армій дзялілася спачатку на рэйхскамісарыяты: «Украіна» на чале з Э. Кохам і «Остланд», якім кіраваў Г. Лозе. Рэйхскамісарыяты складаліся з генеральных акруг: «Беларусь», «Літва», «Валынь – Падолія», «Жытомір», тылавы раён групы армій «Цэнтр». Генеральныя акругі ў сваю чаргу падзяляліся на абласныя акругі (гебіты). Распараджэнні галоўнакамандуючага сухапутнымі войскамі праводзіў у жыццё на пераважнай частцы тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і Полацкага раёна, камандуючы тылам групы армій «Цэнтр» М. фон Шэнкендорф.

Дакладнай даты стварэння гета ў г. Полацку для яўрэйскага насельніцтва невядома. Паводле ўспамінаў відавочцаў, у жніўні 1941 года гета ўжо існавала, яго арганізацыяй займалася мясцовая камендатура. Да гэтага часу яўрэі жылі па сваіх дамах, але ўсіх, акрамя старых і дзяцей, ганялі на прымусовыя працы – падмятаць вуліцы, пілаваць дровы і г.д. Вядома, што нямецка-фашысцкія акупанты знішчалі палітработнікаў, людзей з пэўнай прафесіяй, і у першую чаргу мужчын, тых, хто мог у той ці іншай ступені аказаць супраціўленне «новаму парадку». Верагодна, адна з першых акцый была скіравана на знішчэнне неблаганадзейнай і непрыхільнай часткі яўрэяў: «Праз некалькі дзён пасля акупацыі горада немцы сабралі дзве машыны яўрэяў – і такіх, што на працы былі, і другіх вывезлі. Больш гэтых людзей ніхто не бачыў. Хутчэй за ўсё іх расстралялі» [12].

Усіх яўрэяў перасялілі ў раён вуліц Камуністычнай, Гогалеўскай, Войкаўскай, Інтэрнацыянальнай (былая Яўрэйская) – найбольш разбураная частка горада. На тэрыторыі гета знаходзіліся амбулаторыя, банна-пральны камбінат, электрастанцыя, школа № 12, сінагога, пошта, якая была абнесена калючым дротам, выхад і ўваход забараняўся. З боку вул. Гогалеўскай размешчана шыльда з надпісам «Гета». Тут жа вісеў плакат: «Кожны заўважаны на тэрыторыі лагера «Гета» рускі будзе пакараны». У гета знаходзілася каля 5 тыс. чалавек. Згодна пратаколу допыту відавочца Н. Манш ад 14 чэрвеня 1947 года, пры перасяленні тут жа ў гета і на кватэрах у яўрэйскага насельніцтва былі разрабаваны і канфіскаваны ўсе каштоўнасці і каштоўная маёмасць, пры гэтым яўрэі падвяргаліся жорсткім пакаранням, усе каштоўнасці былі аддадзены ў мясцовую камендатуру [9, с. 234].

Акупацыйныя ўлады імкнуліся атрымаць ад гета ўсё неабходнае для вермахта, гестапа і свайго абагачэння праз арганізацыю адміністрацыйных формаў кіравання ўнутры канцэнтрацыйнага лагера. Дзеля гэтага пры каменданце гета ствараліся юдэнраты і яўрэйская паліцыя. Стварэнне юдэнратаў вызначалася дырэктывай Р. Гейдрыха 1939 года па пытанню абыходжання з яўрэйскім насельніцтвам [10, с. 33]. Юдэнрат (ням. «яўрэйскі савет») – орган, уведзены нямецка-фашысцкімі акупацыйнымі ўладамі для кіравання яўрэйскім насельніцтвам асобных гарадоў і мястэчак, які складаўся з прызначаных уладамі з упаўнаважаных прадстаўнікоў з ліку яўрэяў і нёс адказнасць за выкананне нацысцкіх загадаў і распараджэнняў, што датычыліся асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Пасля стварэння гета юдэнрат адказваў за ўсё, што адбывалася ўнутры яго. Ён хутка прыдбаў галоўную ролю і кантраляваў яўрэйскую паліцыю, пажарную частку, гаспадарчую дзейнасць, забеспячэнне харчаваннем, ахову здароўя, сацыяльныя службы [11, с. 80]. Функцыі кіраўніцтва ў Полацкім гета выконвалі староста, былы сталяр А. Шэрман, і яго намеснік, былы працаўнік майстэрні па рамонту веласіпедаў, С. Апкін, якія па даручэнню немцаў накіроўвалі людзей на працу. А. Шэрман нават бізунамі караў кожнага зняволенага, каб выслужыцца перад акупантамі. Але, дарэчы, яго расстралялі раней за ўсіх.

Перад тым як перасяліць вязняў гета на новае месца, карнікі спланіравана ажыццявілі масавыя расстрэлы яўрэяў: «У жніўні 1941 года ў раёне гор. Полацка немцы арганізавалі масавы расстрэл мірнага насельніцтва яўрэйскай нацыянальнасці. Тут былі расстраляны: Кіст Гіля, яго жонка Рыва, Шульке Мендэль, яго жонка, сям`я Брусіліных, якая складалася з двух дарослых і трох дзяцей, і многія іншыя. Немцы прымушалі капаць для сябе магілы, затым распраналі, расстрэлівалі і скідвалі ў яму» [12]. Дакладнай колькасці расстраляных з ліку вязняў гета не вядома.

У верасні 1941 года гета перамясцілі на ўскраіну горада, у раён в. Лазоўка (цяпер адзін з раёнаў г. Полацка), непадалёку ад ваенных гарадкоў Баравуха-2 і Баравуха-3, тут ужо размяшчалася каля 8 тыс. чалавек [12]. Такая лічба абумоўлена далучэннем яўрэяў з навакольных вёсак. Усіх пасялілі ў 10 бараках. Тэрыторыя была агароджана калючым дротам і ахоўвалася паліцыяй. Рэжым прапускоў быў больш жорсткім, чым раней. Немцы прыязджалі толькі рабаваць: усіх выганялі на вуліцу, загадвалі распранацца (жанчын), потым абшуквалі, забіралі ўсе каштоўныя рэчы і золата. Рэжым у гета быў падпарадкаваны



Polatsk.su

мэтам масавага знішчэння яўрэяў. Ежа выдавалася адзін раз у суткі – мучная баланда без солі і 100 г хлеба, прыгатаванага з сумесі здробненага пілавання са жмыхам. Вады не давалі зусім. Тых, хто не меў сілы для працы, расстрэльвалі або збівалі да паўсмерці. Часта раніцай 2 – 3 чалавекі не паднімаліся на працу – памiралі ад голаду і хвароб. Каля 3000 чалавек з ліку яўрэйскага насельніцтва пасля новага перасялення было расстраляна ў Ельнічы непадалёк ад завода па вырабу цэглы [9, с. 237].

Сказаць дакладна, калі былі поўнасцю знішчаны вязні Полацкага гета, складана. Згодна паказанням відавочцы і вязня гета г. Полацка (прозвішча не названа), змешчаных у зборніку матэрыялаў і дакументаў пад рэдакцыяй Р. Чарнаглазавай, полацкія яўрэі былі знішчаны ў лістападзе 1941 года: «Раніцай 21-га лістапада зноў прыехалі немцы. Мы падумалі, што гэта як і раней, прыехалі грабіць. Усіх выгналі, пастроілі, адчынілі вароты і павялі ў бок Баравухі, гэта 2 – 3 кіламетры ад Лазоўкі, дзе было гета. Аб тым, што вядуць на расстрэл, не здагадваліся. Казалі нават, што ў Палестыну адпраўляюць. Калона выцягнулася на адзін кіламетр. Мы ішлі дзесьці пасярэдзіне, і раптам пачулі стрэлы – гэта першых пачалі расстрэльваць. Калону ахоўвалі паліцэйскія, спрабаваць збегчы можна было. Тое, што расстрэліваюць, зразумелі, калі сталі чутны стрэлы, калі ўжо зварочвалі з дарогі, ужо было бачна. Там ужо было вырыта 5 – 6 ям. Гэта праз дарогу ад рускага могільніка, якое на горачцы. Паліцаі распраналі, вопратку кідалі ў кучу, затым яўрэі ішлі да ямы, іх падганялі паліцаі. Некалькі чалавек спрабавалі збегчы, але іх забілі. Расстрэлівалі немцы з вінтовак, стаялі па пяць каля кожнай ямы» [7, с. 122 – 123].

У рукапісы «Полацк в XX веке» І. Дэйніса згадваецца, што «восенню 1941 года ўсе яўрэі з гета былі пераведзены ў баракі цэглавага завода, маёмасць была рэквізавана немцамі і паліцаямі. Праз некалькі дзён усіх яўрэяў вывезлі з заводу да пясчаных сопак каля Баравухі-2, дзе былі ўжо вырыты траншэі і ўсіх расстралялі: старыкоў, старух, дзяцей і дарослых. Было знішчана каля 9000 чалавек» [13].

Архіўныя дакументы, у прыватнасці Акт Надзвычайнай Дзяржаўнай камісіі аб злачынствах нямецка-фашысцкіх акупантаў у г. Полацку і Полацкай вобласці, датуюць апошні час існавання Полацкага гета – снежань 1941 года – знішчана больш 8000 чалавек мірнага яўрэйскага насельніцтва: «Падчас расстрэлу нямецкія палачы яўрэяў распранaлі, дзяцей многіх кідалі жывымі ў яму, а таксама многіх дарослых кідалі жывымі ў яму і засыпалі зямлёй яшчэ жывымі, асабліва старыкоў. Месца расстрэлаў многіх жыхароў Полацка было за в. Лазоўка за чыгуначным пераездам правей Зялёнага Гарадка, у лесе, у снежні 1941 года» [14]. Вядомы прозвішчы паліцаяў, якія ўдзельнічалі ў масавых расстрэлах полацкіх яўрэяў: Шасцітка, Агурэцкі, Лабецкі, Аўласенка, Любельскі, Правіла [15].

Такім чынам, у г. Полацку было створана два гета, адно – «адкрытага» тыпу ў цэнтры горада, якое, хоць і мела агароджу, але жорсткага кантролю за выхадам з гета не было. Другое – «закрытага» тыпу – было намерана вынесена па-за межы горада ад мясцовага беларускага насельніцтва з далейшай яго ліквідацыяй. У гета былі свае органы ўнутранага парадку – «юдэнрат», старшынёй якога з'яўляўся А. Шэрман. Месцам масавага знішчэння вязняў Полацкага гета была тэрыторыя за в. Лазоўка. Дакладную лічбу знішчанага яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі г. Полацка назваць складана. Звязана гэта ў першую чаргу з недакладнасцю дадзеных Актаў Надзвычайнай Дзяржаўнай камісіі, складзеных на падставе сведчанняў відавочцаў тых падзей, і ўспамінаў, якія даюць розныя лічбы, даты і месцы расстрэлаў. Тым не менш большасць з іх згадваюць лічбу ў 8000 чалавек.

ЛІТАРАТУРА

1. Зеленин, А.В. Холокост: история понятия / А.В. Зеленин // Русская речь. – 2000. – № 3 – 4. – С. 35 – 39.
2. Арад, И. Холокост. Катастрофа европейского еврейства (1933 – 1945) / И. Арад. – Иерусалим: Яд Ва-Шем, 1990. – 165 с.
3. Катастрофа европейского еврейства: в 6 ч. / под ред. Д. Михмана. – Тель-Авив: изд-во Открытого ун-та, 1995. – Ч. 1 – 2: Юдофобия и антисемитизм. – 269 с.
4. Мельников, Д. Империя смерти: Аппарат насилия в нацистской Германии. 1933 – 1945 / Д. Мельников, Л. Черная. – М.: Политиздат, 1987. – 414 с.
5. Гитлер, А. Моя борьба / А. Гитлер. – Смоленск: Русич, 2000. – 658 с.
6. Административное распоряжение № 1 командующего тылом группы армий «Центр» генерала пехоты М. фон Шенкендорфа от 7 июля 1941 г. // Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Фонд. 4683. – Оп. 3. – Д. 952. – Л. 1 – 5.
7. Трагедия евреев Белоруссии в 1941 – 1944 гг.: сб. материалов и докум. / Р.А. Черноглазова, Х. Хеер; ответ. ред. Р.А. Черноглазова. – 2-е изд. – Минск: Гальперин, 1997. – 398 с.
8. Лейзеров, А. Геноцид белорусского еврейства глазами немецких оперативных документов / А. Лейзеров // Актуальные вопросы изучения Холокоста на территории Беларуси в годы немецко-фашистской оккупации: сб. науч. работ / сост. и ред. Я.З. Басин. – Минск, 2006. – С. 148 – 158.
9. Холокост в Беларуси. 1941 – 1944: докум. и материалы / сост.: Э.Г. Иоффе, Г.Д. Кнатько, В.Д. Селеменев. – Минск: НАРБ, 2002. – 276 с.

Polotsk.su

10. Козак, К. Германский оккупационный режим в Беларуси и еврейское население / К. Козак // Актуальные вопросы изучения Холокоста на территории Беларуси в годы немецко-фашистской оккупации: сб. науч. работ / сост. и ред. Я.З. Басин. – Минск, 2006. – С. 23 – 59.
11. Мюллер, Н. Вермахт и оккупация (1941 – 1944) / Н. Мюллер; под ред. А. Юденкова. – М.: Воениздат, 1974. – 387 с.
12. Акт о злодеяниях в Полоцке и Полоцкой области в отношении еврейской национальности // НАРБ. – Фонд. 861. – Оп. 1. – Д. 13. – Л. 5.
13. Дейнис, И.П. Полоцк в XX веке (1905 – 1967 гг.) / И.П. Дейнис // Полоц. ист.-культурн. заповедник. – Фонд КП – S 2774. – Л. 181.
14. Акт о злодеяниях, совершённых немецко-фашистскими захватчиками в г. Полоцке и Полоцкой области // Зональный государственный архив в г. Полоцк. – Фонд. 687. – Оп. 1. – Д. 1. – Л. 23 – 24.
15. Список полицейских, участвовавших в расстрелах еврейского населения // Полоц. ист.-культ. заповедник. – Фонд КДФ-4 2544/1-38. – Л. 2.

## ВЯСКОВЫЯ МОГІЛКІ: ЗРУБНЫЯ НАДМАГІЛЛІ
### (ПА МАТЭРЫЯЛАХ УСХОДНІХ РАЁНАЎ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ І МАГІЛЁЎСКАГА ПАДНЯПРОЎЯ БЕЛАРУСІ)

***канд. мастацтвазн., дац. В.А. ЛАБАЧЭЎСКАЯ***
***(Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск)***

*На падставе палявых матэрыялаў, архіўных фотаздымкаў, гістарычных звестак разглядаюцца два тыпа архаічных зрубных надмагільных пабудоў – рэліктавыя драўляныя домікі («церамкі») і абрубы магіл адным-двума вянцамі зрубаў і дошкамі ў рэгіёне Віцебска-Магілёўскага Падняпроўя Беларусі. Прыцягненне параўнальнага матэрыялу – выяў надмагільных домікаў на гэтак званых «дубровенскіх ручніках», лакалізаваных у зоне бытавання зрубных надмагілляў, а таксама лакалізацыя на данай тэрыторыі памінальнага звычая засцілання на Радаўніцу абрусаў на магілах і сямейных трапез на іх, дзеля чаго прыстасавана форма саміх магіл і пабудоў на іх, дазваляе зрабіць вывад аб устойлівасці архаічных уяўленнеў, звязаных з культам продкаў, які фіксуецца ў гэтым рэгіёне летапіснымі крыніцамі і археалагічнымі матэрыяламі.*

Вясковыя могілкі трэба разглядаць як важную крыніцу ведаў аб культуры лакальных супольнасцей. Надмагільныя помнікі, якія належаць да розных храналічных перыядаў, спосабы афармлення і ўпарадкавання магіл трэба разглядаць як кашоўныя ў інфармацыйным плане артэфакты мінулай і сучаснай культуры беларускай вёскі. Яны сведчаць аб этнічным паходжанні тутэйшага насельніцтва, змене культурных традыцый, а адпаведна таму – светапоглядавых пераменах у свядомасці людзей.

Імкліва змяняецца выгляд вясковых могілак у апошняе дзесяцігоддзе. Асабліва гэта тычыцца спосабаў прадметна-пластычнага афармлення магіл, формы надмагільных помнікаў, ужываемых матэрыялаў. Сакральная пахавальна-памінальная прастора вясковай культуры, якая доўгі час захоўвала свае архаічныя традыцыі, у нашы дні апынулася ў рэчышчы агульных сацыяльна-эканамічных і цывілізацыйна-культурных перамен. Актуальнай зрабілася праблема вандалізму і гэтак званай «чорнай археалогіі», у выніку чаго нішчацца могілкавыя комплексы, знікаюць стражытныя надмагільныя помнікі.

Не выпадкова навукоўцы, мясцовыя краязнаўцы і журналісты ўсё больш увагі надаюць праблеме дакументацыі, прыцягненню грамадскасці да захавання, вывучэння вясковых могілак. Шэраг публікацый у цэнтральнай і мясцовай прэсе апошні час прысвечаны каменным надмагільным крыжам.

Разам з сябрамі навукова-краязнаўчага і грамадскага аб'яднання «Этнагістарычны цэнтр "Явар"» аўтарам на працягу апошніх гадоў праводзіцца мэтанакіраванае абследаванне і фотадакументацыя вясковых могілак на Беларусі. Адной з яго задач з'яўляецца выяўленне архаічных тыпаў надмагільных помнікаў, якія захаваліся на вясковых могілак: каменных крыжоў, каменных жорнаў-помнікаў і зрубных надмагілляў. Першапачатковае абагульненне сабранага матэрыялу ўжо зараз дае магчымасць прасачыць пэўныя рэгіянальныя адрозненні ў тыпах старадаўніх надмагільных помнікаў і спосабах афармлення магіл.

Асаблівая ўвага была скіравана на рэліктавыя зрубныя драўляныя надмагіллі ў выглядзе домікаў, якія наяўна адлюстроўваюць адну з галоўных ідэй культу продкаў.

Пахавальныя пабудовы ў выглядзе драўляных камер с двухсхільным дахам, якія паўтараюць жыллё жывых і з'яўляюцца пасмяротным домам для душы і цела памерлага, вядомы з дахрысціянскіх часоў і распаўсюджаны на шырокай тэрыторыі Еўразіі. Ва ўсходніх славян ён зафіксаваны ад Валыні да Прыанежжа. Да канца XIX стагоддзя такі звычай захоўваўся ў карэлаў і іншых фіна-ўгорскіх народаў, у плямёнах Сібіры і Далёкага Усходу [1, с. 79]. Узвядзенне надмагільных пабудоў было выклікана анімістычнай ідэяй аб прыродзе душы памерлага, якая захоўвае патрэбу ў жыллі, як і жывыя людзі, аб пасмяротным доме для тых, хто пайшоў у іншы свет. Надмагільныя дамы ўвасаблялі адзінства жывых і памерлых